МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ»

Педагогический факультет

# НАУКА. ОБРАЗОВАНИЕ. ТЕХНОЛОГИИ-2008

## МАТЕРИАЛЫ
## МЕЖДУНАРОДНОЙ НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ

**21—22 марта 2008 г.**
**г. Барановичи**
**Республика Беларусь**

***Под общей редакцией В. В. Таруца***

**В 3 книгах**
**Книга 3**

## АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ РЕФОРМИРОВАНИЯ ПЕДАГОГИЧЕСКОГО ОБРАЗОВАНИЯ

Репозиторий БарГУ

Барановичи
РИО БарГУ
2008

УДК 37(063)
ББК 74.58
Н34

Р е ц е н з е н т ы:

*Л. Малиновска*, доктор педагогических наук,
Латвийский сельскохозяйственный университет, Латвия;
*Н. Я. Игнатенко*, доктор педагогических наук, профессор,
Крымский гуманитарный университет, Украина

Р е д а к ц и о н н а я к о л л е г и я:

*Н. В. Зайцева (главный редактор), Ю. В. Башкирова, Е. И. Белая, В. И. Денищик, В. Н. Зуев, З. Н. Кветко, А. А. Ковалевская, А. Р. Коршун, Л. Ф. Мирзаянова, Л. С. Одинец, С. К. Рындевич, К. С. Тристень*

**Н34** **Наука. Образование. Технологии-2008** [Текст] : материалы Междунар. науч.-практ. конф., 21—22 марта 2008 г., Барановичи, Респ. Беларусь : в 3 кн. / под общ. ред. В. В. Таруца. — Барановичи : РИО БарГУ, 2008. — Кн. 3 : Актуальные проблемы реформирования педагогического образования / редкол.: Н. В. Зайцева (гл. ред.) [и др.]. — 382[2] с. — 110 экз.
ISBN 978-985-498-115-4 (Кн. 3)
ISBN 978-985-498-112-3

В сборнике представлены статьи участников Международной научно-практической конференции, в которых рассматриваются психолого-педагогические, организационно-методические проблемы воспитания и обучения в общеобразовательных, среднеспециальных и высших учебных заведениях.

Материалы предназначены для широкого круга научных работников, преподавателей, учителей общеобразовательных школ, педагогов дошкольных учреждений, аспирантов и студентов.

**УДК 37(063)**
**ББК 74.58**

**ISBN978-985-498-115-4 (Кн. 3)**
**ISBN978-985-498-112-3**

© Коллектив авторов, 2008
© БарГУ, 2008

Репозиторий БарГУ

# АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ВЫКЛАДАННЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ВНУ

*А. У. Літвінскі*

Гістарычная адукацыя з'яўляецца складовай часткай гуманітарнай адукацыі ў вышэйшых навучальных установах. Асаблівае значэнне яна набыла ў перыяд станаўлення незалежнай Рэспублікі Беларусь, які пачаўся ў 1991 г. і працягваецца ў наш час. Дадзены тэзіс наўрад ці мае патрэбу ў разгорнутым доказе. Звычайна звяртаюць увагу на выхаваўчы патэнцыял гісторыі, перш за ўсё, гісторыі Беларусі — «Маці-Краіны». Сапраўды, гэты аспект вельмі важны. Толькі на аснове трывалых ведаў па айчыннай гісторыі, а таксама неабыякавага стаўлення да мінулага Бацькаўшчыны магчымае фарміраванне асобы грамадзяніна і патрыёта.

Аднак гістарычная адукацыя мае таксама экзістэнцыяльна-аксіялагічны сэнс, наяўнасць якога, на наш погляд, яшчэ не ў поўнай ступені ўсвядомлена грамадскасцю. Цікавасць да гісторыі можа ўзнікнуць у асобы толькі ў тым выпадку, калі гістарычныя веды азначаюць нешта важнае ў яе жыцці. На вялікі жаль, у часткі сучасных студэнтаў істотна зніжаны ўзровень матывацыі да вывучэння гісторыі. Яны адносяцца да гэтага занадта прагматычна, разглядаючы набыццё гістарычных ведаў толькі ў якасці ўмовы атрымання станоўчай адзнакі на экзамене. Зразумела, у такой сітуацыі аб трывалым засваенні ведаў не можа быць гаворкі. Амаль да нулявой адзнакі зніжаецца ў гэтым выпадку выхаваўчы патэнцыял гісторыі.

Каб знайсці выйсце з дадзенага крызісу, выкладчык ВНУ павінен перш за ўсе адказаць сам для сябе на тры ўзаемазвязаныя пытанні: «Навошта вывучаць? Што вывучаць? Як вывучаць?» Аналізу праблемы суадносін аксіялагічнага, кагнітыўнага і метадычнага кампанентаў гістарычнай адукацыі прысвечаны дадзены артыкул. У працэсе яго падрыхтоўкі аўтор выкарыстоўваў метады структурна-функцыянальнага аналізу, індукцыі і дэдукцыі, назірання і параўнання [10, с. 209—226]. Адразу неабходна папярэдзіць, што размова пойдзе пра навучанне тых студэнтаў, якія не звязваюць сваю будучыню са спецыяльнасцю «гісторыя». Аўтар выкладае свой суб'ектыўны погляд, не прэтэндуе на ўсеабдымны разгляд гэтага комплекса пытанняў і разумее, што дадзеная праблема з'яўляецца дыскусійнай.

Як было ўжо адзначана, аксіялагічны кампанент гістарычнай адукацыі з'яўляецца вельмі важным. Студэнт, усведамляючы неабходнасць вывучэння гісторыі, павінен сам для сябе знайсці адказ на пытанне, навошта гэта яму асабіста патрэбна. У студэнтаў негістарычных спецыяльнасцей распаўсюджана ўяўленне пра гісторыю як пра дысцыпліну навучальнага плана, якую неабходна «здаць». Такі падыход у шмат чым абумоўлены аб'ектыўным узроўнем іх здольнасцей. Пры гэтым далека не у ва ўсіх у школьныя гады была закладзена трывалая база гістарычных ведаў. І выкладчыкам ВНУ не трэба, як гэта часам адбываецца, вінаваціць ва ўсім школу, хаця ў ёй апошнім часам адбываецца стандартызацыя і тэхналагізацыя навучання, што, на нашу думку, не спрыяе развіццю арыентаванага на творчы пошук гістарычнага мыслення. У пэўнай ступені школьны настаўнік знаходзіцца ва ўмовах, калі ён вымушаны не выкладаць, а «праходзіць» прадметы гуманітарнага цыклу. Аднаго ўрока ў тыдзень вельмі мала для таго, каб гісторыя Беларусі стала любімым школьным прадметам.

Якім чынам выкладчык ВНУ можа дапамагчы студэнту сфарміраваць матывацыю да вывучэння гісторыі Беларусі? Вельмі не хацелася б, каб яна фарміравалася па прынцыпе: «не здасі — адлічаць». Парадокс сітуацыі ў тым, што гэткім чынам у студэнта можа выпрацавацца ўстойлівая фобія, і яна якраз не дасць яму паспяхова вытрымаць экзаменацыйнае выпрабаванне. Зразумела, гаворка не ідзе аб залішняй ліберальнасці, але ўсё ж мэтазгодна пашукаць іншыя шляхі павышэння ўзроўню матывацыі. Зрэшты, устойлівая цікавасць да пэўнай дысцыпліны з'яўляецца перадумовай атрымання высокай адзнакі на экзамене.

Мэтазгодна імкнуцца да таго, каб зацікавіць студэнтаў, развіваючы эмацыянальна станоўчую матывацыю. Зразумела, тут будзе вельмі прыдатны асобасна-арыентаваны падыход. Могуць запярэчыць, што ва ўмовах універсітэцкага навучання выкладчыку цяжка ўсталяваць канструктыўную камунікацыю з кожным студэнтам. Аднак імкнуцца да гэтага трэба. У дадзеным выпадку шмат што залежыць ад асобы гісторыка-прафесіянала.

Пры гэтым не варта «адкрываць Амерыку». Напрыклад, у дадзеным кантэксце прыдатная такая традыцыйная форма работы, як падрыхтоўка студэнтамі дакладаў і рэфератаў, паколькі студэнт можа выбраць тэму рэферата і прапанаваць тэму даклада ў адпаведнасці са сваімі інтарэсамі і густамі [2, с. 4].

Вельмі плённым з'яўляецца шырокае вакарыстанне выкладчыкам у сваіх лекцыях краязнаўчага матэрыялу. Каб гісторыя ўспрымалася на асобасным узроўні, надзвычай важна закрануць нейкую струнку душы студэнта. Звесткі пра тое, што ў тваёй роднай мясцовасці адбыліся адметныя гістарычныя падзеі, адносяцца да інфармацыі з выразна-эмацыянальнай афарбоўкай. У такім выпадку гісторыя ўспрымаецца студэнтам не столькі як акадэмічная навука, колькі ў якасці апавядання пра мінулае сваіх продкаў.

Экзістэнцыяльны сэнс гісторыі цесна звязаны з праблемай самарэалізацыі асобы ў жыцці [4, с. 5]. Студэнты, як правіла, разумеюць, што веданне гісторыі неабходнае для іх «агульнага развіцця». Выкладчыку неабходна акцэнтаваць увагу на гэтым пастулаце. Можна пагадзіцца з тым, што «харызматычнасць пазнавальнай функцыі гістарычнай навукі дае падставы для сцвярджэння наступнага зместу: калі чалавек не ведае, напрыклад, геалогіі альбо некаторых іншых навук, ён можа лічыць сябе адукаваным, але пры ўсіх

Рэпазіторый БарДУ

акалічнасцях нельга лічыць сябе такім, не ведаючы гісторыі сваей Бацькаўшчыны, не спасцігнуўшы каштоўнасцей іншых цывілізацый» [4, с. 5].

Яшчэ адным важным аспектам аксіялагічнага кампанента выкладання гісторыі з'яўляецца магчымасць разгляду праблемы лёсу чалавека ў супярэчлівых абставінах мінулага. Справа ў тым, што мы прывыклі вывучаць гісторыю войнаў і рэвалюцый, ідэй і накірункаў і часам не прымаем да ўвагі, што гісторыя ў першасным, этымалагічным сэнсе слова — гэта апавяданне пра жыццё канкрэтных людзей. Выкладчык можа «ажывіць» мінулае і тым самым дапаможа студэнтам зразумець, што ў гісторыі дзейнічаюць ў першую чаргу асобы, а потым ужо выканаўцы функцыянальных абавязкаў. Такім чынам ствараецца псіхалагічны эфект эмпатыі.

Безумоўна, выкладчыку нельга пераацэньваць свае сілы і спадзявацца, што ўсе студэнты будуць з цікавасцю авалодваць гістарычнымі ведамі. Ідэал, як вядома, недасягальны. Аднак да яго варта імкнуцца.

Надзвычай актуальным з'яўляецца пытанне зместу гістарычнай адукацыі ў ВНУ. Відавочна, што фундаментальныя грамадзянскія і патрыятычныя каштоўнасці можна сфарміраваць толькі на аснове трывалых ведаў. Вобласць гістарычных ведаў неабсяжная, і распрацоўшчыкі навучальных праграм, аўтары падручнікаў і навучальных дапаможнікаў, выкладчыкі непазбежна сутыкаюцца з неабходнасцю выбару: які аб'ем матэрыялу можна лічыць адначасова і неабходным, і дастатковым?

У апошні час быў выдадзены шэраг навучальных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі [1; 3 — 7; 9; 11; 12]. Іх моцным бокам з'яўляецца пераемнасць са школьнымі праграмамі і падручнікамі. У працэсе навучання студэнт не рызыкуе трапіць у сітуацыю «інфармацыйнага шоку». Нават калі ён не вылучаўся стараннасцю ў школьныя гады, усё роўна яму лягчэй адаптавацца да новых адукацыйных умоў. Аднак многія факты гісторыі Беларусі ў дадзеных дапаможніках разглядаюцца ў якасці ўжо вядомых і засвоеных студэнтамі яшчэ ў той час, калі яны былі школьнікамі. Зразумела, на самой справе гэта, мякка кажучы, не зусім так. Таму выкладчыку даводзіцца вырашаць задачу паўтарэння, а ў адносінах да пэўнай катэгорыі студэнтаў і першаснага засваення, так бы мовіць, элементарных гістарычных ведаў. Ён можа звярнуць увагу студэнтаў на вызначальных фактах гісторыі Бацькаўшчыны ў час правядзення лекцый, у ходзе дыскусіі на семінарах.

Вельмі прыдатным спосабам актывізацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў можна лічыць выкарыстанне тэставых заданняў. Даты і падзеі, імёны гістарычных дзеячоў і спецыяльныя тэрміны, геаграфічныя назвы і этнонімы, помнікі літаратуры і мастацтва — усе гэтыя гістарычныя рэаліі могуць знайсці свае адлюстраванне ў тэстах. Праблема выкарыстання тэстаў патрабуе асобнай размовы, а ў разгляданым намі кантэксце неабходна зазначыць, што і залішне захапляцца імі не трэба, паколькі гэта не спрыяе глыбокаму разуменню гісторыі. А вось у ходзе праверкі і замацавання набытых ведаў яны даволі эфектыўныя.

Аўтарам навучальных дапаможнікам не заўжды ўдаецца пазбегнуць своеасаблівай псіхалагічнай пасткі: яны часам не суадносяць уласны ўзровень успрыняцця гістарычнай інфармацыі з узроўнем адрасатаў іх твораў — студэнтаў. У выніку тое, што для аўтараў з'яўляецца абсалютна зразумелым, можа ўяўляць пэўныя цяжкасці для студэнтаў. Безумоўна, мы не заклікаем да празмернага спрашчэння тэкстаў, што можа прывесці да недапушчальнай прымітывізацыі. Ідэальным варыянтам было б дасягненне такога стану, пры якім структура тэкстаў была б рознаўзроўневай па ступені складанасці ўспрыняцця. Табліцы, графікі, схемы, у тым ліку картасхемы павінны заняць належнае масца ў дапаможніках. Аднак паколькі гэта — справа будучыні, спадзяемся, не такой ужо і далёкай, то і тут есць поле для дзейнасці выкладчыка ВНУ.

Нам абсалютна справядліва запярэчаць, што востры недахоп часу, які адчуваюць выкладчыкі, не спрыяе творчай дзейнасці ў дадзеным накірунку. Сапраўды, гэта так. Аднак у ходзе лекцый і семінарскіх заняткаў, ды і кансультацый ён можа вылучыць галоўнае у гістарычным матэрыяле і аддзяліць яго ад другаснага.

Які́м жа павінна быць, вобразна кажучы, «ядро» гістарычных ведаў, якія студэнт павінен трывала засвоіць і пераўтварыць у сістэму духоўных каштоўнасцей? Падрабязны разгляд гэтага пытання выходзіць за межы дадзенага артыкула. Можна толькі ў якасці тэзіса адзначыць, што неабходна акцэнт рабіць на комплексе ведаў, якія маюць патрыятычна-выхаваўчы, у пэўнай ступені знакава-сімвалічны для беларускай нацыянальнай самасвядомасці характар. Варта растлумачыць гэты тэзіс на канкрэтных прыкладах.

«Сярэднестатыстычны» студэнт можа не ведаць імя Міхалона Літвіна, а вось імя Сымона Буднага ён ведаць абавязаны. Нельга папракаць яго за тое, што ён не памятае год уступлення на трон Рэчы Паспалітай Жыгімонта Вазы, але тое, што ў 1588 г. быў прыняты III Статут ВКЛ, не павінна выветрыцца з яго памяці. Ён можа мець цьмянае ўяўленне пра бітву за авалоданне Акінавай, аднак пры гэтым павінен абсалютна дакладна ўяўляць сабе агульны ход аперацыі «Баграціён». У яго можа не выклікаць цікавасці факт колішняй наяўнасці замка ў Смалянах, але наяўнасцю замка ў Міры — шэдэўра беларускага дойлідства — ен абавязаны ганарыцца.

Безумоўна, кожны выкладчык рады вітаць праяву цікавасці да сваёй дысцыпліны з боку адораных студэнтаў. Аднак і яны, знаходзячыся пад уплывам самых розных інфармацыйных плыняў вельмі сумнiўнай чысціні, з'яўляюцца носьбітамі мазаічнага тыпу гістарычнай свядомасці. Як ужо было адзначана, «часта чытач задавальняе свае патрэбы ў рознага роду шматлікіх падробках пад навуковыя працы, аўтары якіх свае «адкрыцці» за ісціну, за праўду гісторыі. Зразумела, што разабрацца ў такіх «навуковых» адкрыццях непадрыхтаванаму гістарычна і палітычна чалавеку складана, а тым больш маладому, без дастатковых глыбокіх ведаў і пэўнага жыццёвага вопыту» [11, с. 3—4]. Да гэтага можна дадаць, што пад яшчэ большым, у параўнанні з чытачамі, інфармацыйным уплывам знаходзяцца гледачы і карыстальнікі Інтэрнета.

На наш погляд, у дадзенай сітуацыі выкладчык павінен аргументавана адстойваць сваю пазіцыю ў дыялогу са студэнтамі. Пры гэтым вялікае значэнне мае яго асабісты аўтарытэт як навукоўца. У той жа час ён , канечне ж, мае поўнае права знаёміць студэнтаў з альтэрнатыўнымі пунктамі гледжання на тую альбо іншую навуковую праблему.

Такім чынам, выкладанне гісторыі ў ВНУ павінна мець у якасці аксіялагічнага фундамента экзістэнцыяльна ўспрынятыя студэнтамі грамадзянска-патрыятычныя каштоўнасці. Змест гістарычнай адукацыі, а таксама адпаведныя метадычныя падыходы павінны садзейнічаць фарміраванню ў студэнцкай моладзі дадзенай сістэмы каштоўнасцей.

**Спіс крыніц**


1. Гісторыя Беларусі : вучэб. дапам. / пад рэд. А. Г. Каханоўскага і інш.— Мн. : Экаперспектыва, 1996. — 496 с.
2. Гісторыя Беларусі: планы семінарскіх заняткаў, літаратура, мет.парады / А. Ф. Рабаў [і інш.]. БарДУ, 2002. — 140 с.
3. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай цывілізацыі) : вучэбны дапаможнік / В. Г. Галубовіч [і інш.]; пад рэд. В. І. Галубовіча і Ю. М. Бохана. — Мн. : Экаперспектыва, 2005. — 584 с.
4. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый: вучэб. дапам. : у 2 ч. / Пад рэд. А. А. Кавалені, В. Ф. Касовіча. — Мн. : БДПУ, 2004. — Ч. 1. — 150 с.
5. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый: вучэб. дапам. : у 2 ч. / Пад рэд. А. А. Кавалені, В. Ф. Касовіча. — Мн. : БДПУ, 2005. — Ч. 2. — 211 с.
6. Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі. / У. А. Сосна [і інш.]; пад рэд. Л. В. Лойкі. — Мн. : РІВШ, 2004. — 332 с.
7. История Беларуси / В. П. Емельянчык [і інш.]; под ред. А. Г. Кохановского, О. А. Яновского. — Мн. : Юніпрес, 2005. — 414 с.
8. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. И. Н. Кузнецов. — Минск : Амалфея, 2000. — 672 с.
9. *Ковкель, И. И.* История Беларуси с древнейших времен до настоящего времени / И. И. Ковкель, Э. С. Ярмусик : 6-е изд. — Минск : Аверсэв, 2006. — 604 с.
10. Методологические проблемы истории: учебное пособие / В. Н. Сидорцов [и др.]. Под общ. ред. В. Н. Сидорцова. — Минск : ТетраСистемс, 2006. — 352 с.
11. *Саракавік, І. А.* Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І. А. Саракавік. — Мн. : «Современная школа», 2006. — 456 с.
12. *Чигринов, П. Г.* Очерки истории Беларуси: учеб. пособ. для вузов / П. Г. Чигринов. — Минск : Вышэйшая школа, 2000. — 672 с.


Репозиторий БарГУ